# АСАБЛІВАСЦІ МАГДЭБУРГСКАГА ПРАВА Ў МАГІЛЁВЕ

***Ю. Я. Козікаў***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

Магдэбургскае права (нем. Magdeburger Recht) – адна з найбольш вядомых сістэм гарадскога права. Яно склалася ў XIII ст. у нямецкім горадзе Магдэбургу як феадальнае гарадское права, паводле якога эканамічная дзейнасць, маёмасныя правы, грамадска-палітычнае жыццё і саслоўны стан гараджан рэгуляваліся ўласнай сістэмай юрыдычных норм, што адпавядала ролі гарадоў як эканамічных цэнтраў. У час сярэднявечча гарады Беларусі развіваліся ў агульнаеўрапейскім кантэксце. Час утварэння большасці беларускіх гарадоў і тэмпы іх развіцця дазвалялі ім выкарыстоўваць многія дасягненні і формы, у тым ліку і прававыя, якія склаліся ў Заходняй Еўропе, напаўняючы іх сваім непаўторным уласным сэнсам. Патрэбна адзначыць, што нормы беларускага звычаёвага права былі дапоўнены, а не заменены Магдэбургскім правам. Адначасова неабходна падкрэсліць, што граматы на Магдэбургскае права насілі больш дэкларатыўны характар, хаця і забяспечвалі гораду пэўную долю самастойнасці. У Магілёве, як і ў іншых гарадах Беларусі, была выкарыстана нямецкая прававая форма, якая была напоўнена ўласным мясцовым зместам.

Сістэмнае вывучэнне эвалюцыі інстытута гарадскога самакіравання з'яўляецца ў гісторыі права адным са значных накірункаў. Даследаванне Магдэбургскага права Магілёва дазволіць асэнсаваць мадэль грамадска-прававога жыцця феадальнага горада. Нягледзячы на тое што значны ўклад у развіццё праблемы ўнеслі такія даследчыкі, як Я. А. Юхо, Т. І. Доўнар, Г. В. Дзербіна, А. Ф. Свіб, што пытаннямі існавання Магдэбургскага права ў Магілёве займаліся В. І. Мялешка, І. А. Марзалюк і інш., шмат аспектаў гэтай важнай праблемы застаюцца недаследаванымі.

На падставе нашага даследавання вылучаем наступныя асаблівасці існавання Магдэбургскага права ў Магілёве:

1. Прывілеі на Магдэбургскае права Магілёў атрымаў у 1561 і 1577 г. – некалькі пазней, чым іншыя гарады Беларусі (Вільня, 1387 г., Брэст,

1390 г.).

2. Дараванне Магдэбургскага права гораду было перш за ўсё звязана з геапалітычным становішчам Магілёва і абвастрэннем адносін з Маскоўскай дзяржавай, таму рэалізацыя норм Магдэбургскага права разгледжвалася як адна з умоў ваеннага ўмацавання самога горада і ўсходніх межаў дзяржавы.

3. Пры захопе Магілёва рускім войскам скасавання Магдэбургскага права не адбылося, хаця расійскія гарады не мелі самакіравання, маскоўскі цар Аляксей Міхайлавіч пацвердзіў правы гараджан.

4. На фарміраванне Магдэбургскага права актыўна ўплывала мясцовае звычаёвае права. Так, у Магілёве, акрамя звычайных для Магдэбургскага права службоўцаў, меліся і старажытныя – дзесяцкія. У дапамогу войту былі назначаны 4 сотнікі, без якіх войт не меў права прымаць рашэнні. Войт і сотнікі карысталіся асобнымі льготамі (войт вызваляўся ад падатку за валоданне маёмасцю і за валоку гарадской зямлі, атрымліваў адну трацiну з «вин» судовых, а сотнікі вызваляліся ад падатку за паўвалокі зямлі).

5. На Магілёўшчыне існавала і асаблівасць інстытута войтаўства. Спачатку войт прызначаўся вялікім князем пажыццёва, што сведчыла аб абмежаванасці самакіравання, і толькі з 1661 г. войта пачынае выбіраць магістрат. Знаходжанне войта ў Магілёве не было абавязковым, у XVI ст. горадам фактычна кіравалі лентвойты (прызначаемыя войтам), а войты з’яўляліся ў горадзе толькі зрэдку.

6. Канчаткова магістрат Магілёва сфарміраваўся напрыканцы XVII ст., у выніку ў 1690 г. ён складаўся з 12 асоб: войта, 2 бурмістраў, 4 радцаў, 3 лаўнікаў і 2 шафараў (скарбнікаў), прытым былі як католікі, так і праваслаўныя, прадстаўнікі розных груп насельніцтва.

7. Магдэбургскае права ў Магілёве было скасавана ў 1775 г. паводле ўказа Кацярыны II пасля далучэння Усходняй Беларусі да Расійскай імперыі.